канаўчымі мастацкімі вобразамі. Экспазіцыя мела ўстойлівы дэвіз – «Традыцыя і сучаснасць», які мяркуе выкарыстанне і развіццё на сучасным узроўні традыцыйных тэхналогій, прыёмаў і спосабаў працы, зыходзячы з вопыту айчыннай тэхналогіі апрацоўкі прыродных матэрыялаў. Актуальная візуальная інфармацыя прадстаўляла гледачу звесткі па гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а сучасная імправізацыя з трывалымі і ўстойлівымі традыцыямі надавала экспазіцыі асаблівую энергетыку.

УДК 645.5(44):347.78.025

**_А. Г. Міцкевіч,_**
_кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Навукова-практычны цэнтр Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь»;_

**_І. М. Скварцова,_**
_кандыдат мастацтвазнаўства, загадчык аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;_

**_Е. У. Сенькевіч,_**
_старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Навукова-практычны цэнтр Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь»;_

**_Н. В. Шаркова,_**
_магістр мастацтвазнаўства, малодшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Навукова-практычны цэнтр Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь», Рэспубліка Беларусь_

# АТРЫБУЦЫЯ ФАРФОРАВАЙ ВАЗЫ ВЫТВОРЧАСЦІ ЛІМОЖСКАЙ МАНУФАКТУРЫ ЖАНА ПУЯ (ФРАНЦЫЯ)

**Анатацыя.** Артыкул падрыхтаваны па выніках мастацтвазнаўчай атрыбуцыі фарфоравай вазы з прыватнага збору, у ходзе якой было

ўстаноўлена прадпрыемства-вытворца – мануфактура Жана Пуя ў г. Лімож (Францыя), і прыкладны час стварэння – 1840–1860-я гг.

**Ключавыя словы:** мастацка-гістарычная атрыбуцыя, французскі фарфор, ліможскія фарфоравыя мануфактуры Жана Пуя.

***A. Mickiewicz,***
*Candidate of Biological Sciences, Associate Professor of the Department of Folk Arts and Crafts of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Leading Researcher of the State Institution "Scientific and Practical Center of the State Committee for Forensic Examinations of the Republic of Belarus";*

***I. Skvortsova,***
*Candidate of Art History, Head of the Department of Fine and Decorative-Applied Arts of the State Academic Institution "The Center for Belarusian culture, language and literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus";*

***E. Senkevich,***
*Senior Researcher of the State Institution "Scientific and Practical Center of the State Committee for Forensic Examinations of the Republic of Belarus";*

***N. Sharkova,***
*Master of art history, Junior Researcher of the State Institution "Scientific and Practical Center of the State Committee for Forensic Science of the Republic of Belarus",*
*Republic of Belarus*

# ATTRIBUTION OF A PORCELAIN VASE OF MANUFACTORY BY JEAN POUYAT (LIMOGES, FRANCE)

**Abstract.** The article was prepared based on the results of art attribution of a porcelain vase from a private collection. During the attribution, it was possible to establish the manufacturer – the manufactory of Jean Pouyat in Limoges (France), and the approximate time of creation – 1840–1860-s.

**Keywords:** artistic and historical attribution, French porcelain, Limoges porcelain manufactories, Jean Pouyat.

Вырабы ліможскіх фарфоравых мануфактур на антыкварным рынку Рэспублікі Беларусь сустракаюцца дастаткова часта, яны рэгулярна становяцца аб'ектамі мастацтвазнаўчых даследаванняў. Па выніках аднаго з іх падрыхтаваны дадзены артыкул.

На мастацтвазнаўчую экспертызу з прыватнай калекцыі была прадстаўлена дэкаратыўная фарфоравая ваза (вышыня – 58 см) з нізкай ножкай на круглай аснове, цыліндрычным корпусам, шырокай гарлавінай з фестончатым краем, ляпнымі ручкамі (мал. 1).



*Мал. 1.* Агульны выгляд прадстаўленай на экспертызу вазы

Ваза дэкарыравана ў тэхніках надпаліўнага крыцця блакітнай фарбай, паліхромнага роспісу і роспісу золатам.

Паліхромная кампазіцыя з адлюстраваннем класіцыстычнага пейзажу з купінамі дрэваў і возерам, руінамі сярэдневяковага замка і стафажнымі жаночымі фігуркамі размяшчаецца ў авальным рэзерве на корпусе вазы (мал. 2). Вышэй – на аплеччы – золатам выканана сіметрычная арнаментальная кампазіцыя з геаметрычных фігур і раслінных парасткаў. Залатая абводка нанесена на гарлавіну, аснаванне і аплечча, золатам абмежаваны рэзерв і акцэнтаваны ляпны дэкор ручак вазы (мал. 3).



*Мал. 2.* Роспіс у рэзерве на корпусе вазы



*Мал. 3*. Арнаментальная кампазіцыя на аплеччы вазы

Ваза маркіравана кляймом зялёнага колеру ў выглядзе вялікіх лацінскіх літар «J.P / L» (мал. 4). Зялёны колер маркі і літара «L» у ёй дазволілі вызначыць прадстаўленую на экспертызу вазу як твор французскага ліможскага фарфору.




*Мал. 4.* Марка на дне вазы

Аднак паняцце «ліможскі фарфор» не з’яўляецца найменнем нейкага канкрэтнага вытворцы ці мануфактуры, а распаўсюджваецца на прадукцыю ўсіх фарфоравых прадпрыемстваў Ліможа, а таксама фарфоравых мануфактур дэпартамента Верхняя В’ена, адміністратыўным цэнтрам якога з’яўляецца г. Лімож.

Яшчэ з часоў Сярэдневякоўя Лімож меў рэпутацыю аднаго з вядучых цэнтраў вытворчасці прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ужо ў XII ст. тут на высокім узроўні была развіта вытворчасць шклопадобных эмаляў, а з першай трэці XVIII ст. – фаянсавага посуду. У 1767 г. непадалек ад Ліможа распачалася здабыча высакаякаснага кааліну – асноўнай сыравіны для вытворчасці фарфору. Першая фарфоравая мануфактура пачала працаваць у Ліможы ў 1771 г., у 1784 г. яна атрымала статус Каралеўскай мануфактуры, а ў 1794 г. далучылася да знакамітай Сеўрскай мануфактуры.

Да сярэдзіны XIX ст. Лімож і яго ваколіцы сталі адным з вядучых цэнтраў Францыі па вырабе фарфору вышэйшага гатунку. На працягу XIX – пачатку XX ст. у вытворчасці дэпартамента Верхняя В’ена было задзейнічана некалькі дзясяткаў прадпрыемстваў, якія спецыялізаваліся на вырабе і (або) роспісе фарфору. Многія з іх існавалі непрацяглы тэрмін, іншыя шматразова мянялі ўласнікаў, назвы, аб’ядноўваліся з іншымі ці наадварот, падзяляліся на некалькі асобных мануфактур.

Удакладніць прадпрыемства-вытворцу прадстаўленай на экспертызу вазы дазволіла ідэнтыфікацыя літар «J.P», якая была здзейснена ў ходзе працяглага вывучэння ліможскіх фарфо-

равых прадпрыемстваў і іх прадукцыі: літарамі «J.P» свае вырабы маркіравала фарфоравая мануфактура Ліможа, якая належала прадпрымальніку Жану Пуя.

Жан Пуя (*Jean Pouyat*) (?–1849) быў прадстаўніком вядомай дынастыі вытворцаў фарфору ў рэгіёне. Яго дзед, П’ер Пуя, у другой палове XVIII ст. валодаў месцанараджэннямі кааліну і фарфоравай мануфактурай у Ліможы. Сямейную справу прадоўжыў і пашырыў бацька Жана Пуя – Франсуа Пуя: у 1800 г. у дадатак да ліможскага прадпрыемства ён набыў парыжскую фарфоравую мануфактуру Лакрэ і да 1823 г. з’яўляўся яе ўласнікам. Менавіта на мануфактуры ў Парыжы пачаў свой шлях Жан Пуя. Разам з братамі Жанам-Бацістам і Леанардам ён пасяхова кіраваў парыжскім прадпрыемствам, у той час як бацька працягваў жыць у Ліможы і займаўся сваім заводам і здабычай кааліну.

З 1842 г. Жан Пуя стаў паўнамоцным уладальнікам фарфоравай мануфактуры ў Ліможы, якая размяшчалася на плошчы Кармелітаў. Вырабы мануфактуры маркіраваліся ініцыяламі ўладальніка «J.P.» і літарай «L» (Ліможа).

*Табліца*

Храналогія марак на прадукцыі фарфоравай мануфактуры Жана Пуя ў Ліможы

1842–1875




1842–1875




1876–1890




Пасля 1890, кароткі тэрмін




1890–1914




1891–1932




1891–1932




1891–1932




1914–1932




1914–1932



Пасля смерці Жана Пуя ў 1849 г. прадпрыемства перайшло да яго сына, з 1883 г. яно некалькі разоў мяняла назву, аднак у маркіроўцы вырабаў ініцыялы або імя Жана Пуя працягвалі прысутнічаць аж да 1932 г., што дэманструе зробленая ў час экспертнага даследавання выбарка клейм, прадстаўленая ў табліцы.

Кляймо на вазе, прадстаўленай на экспертызу, адпавядае маркіроўцы прадукцыі мануфактуры Жана Пуя ў перыяд з 1842 па 1875 г.

Мастацка-стылістычныя асаблівасці вазы (яе форма, прыёмы і прынцыпы дэкаратыўнага аздаблення, трактоўка пейзажнай кампазіцыі ў рэзерве і інш.) дазволілі датаваць яе 1840–1860-мі гг.

---

1. *Auscher, E. S.* A history and deskription of French porcelain / E. S. Auscher. – London, New York [etc.]: Cassell and Company, Ltd., 1905. – 414 p.

2. *Gaston, M. F.* The collector's encyclopedia of Limoges porcelain / M. F. Gaston. – Paducah, Ky. : Collector Books, 1992. – 223 p.

3. *Meslin-Perrier, Ch.* La Manufacture de Porcelaine Pouyat: Limoges. 1835–1912 / Ch. Meslin-Perrier, L. Monnerie, J. d`Albis, N. des Horts / Biennale Internationale des Arts du Feu de Limoges Musée National Adrien Dubouché. – Paris : Editions Varia, 1994. – 141 p.

4. *Poche, E.* Porzellanmarken. Aus aller Welt / Emanuel Poche. – Praha : Artia Verlag, 1975. – 255 p.

5. *Waterbrook-Clyde, K.* The Decorative Art of Limoges Porcelain and Boxes (Schiffer Book for Collectors) / K. Waterbrook-Clyde, Th. Waterbrook-Clyde. – Pennsylvania : Schiffer Publishing, 1999. – 224 p.

6. *Waterbrook-Clyde, K.* Distinctive Limoges Porcelain: Objets d'Art, Boxes, and Dinnerware / K. Waterbrook-Clyde, Th. Waterbrook-Clyde. – Pennsylvania : Schiffer Publishing, 2000. – 224 p.

7. *De Plinval De Guillebon, R.* Paris Porcelain 1770–1850 / R. De Plinval De Guillebon. – New York : Walker & Company, 2012. – 332 p.